# Люты

1/19. Ігнат. Беларусы-католікі некалі казалі: "На святога Ігната зіма багата, а Ігнат Грамніцам рад" (Паўлюкоўскі, 1934).

2/20. Грамніцы, Стрэчанне - дзень сустрэчы зімы з летам у католікаў і Грамаўніка (язычніцкага бога Перуна). Лічыцца, што ўжо могуць быць грымоты, навальніцы і прайшла палова зімы. Аб гэтым сведчаць прыказкі: "На Грамніцы палавіна зіміцы", "Грамніца - хлебу палавіца, а корму трацiна". На Стрэчанне наглядалі за надвор'ем. Існавалі прыкметы: якое надвор'е на Грамніцы, такая й вясна; як на Грамніцы адліга -- з ураджаю будзе фіга, і інш.

У прыродзе адчуваецца пацяпленне, са стрэх бягуць першыя капяжы. "На Грамніцы певень нап'ецца, на Дабравешчанне (Звеставанне) -- вол" (Паўлюкоўскі, 1934).

У Свіслацкім раёне Гродзенскай вобласці, дзе жывуць праваслаўныя і католікі, было пачута, што "паміж польскімі і нашымі Грамніцамі не трэба снаваць кросны, бо ваўкі будуць снаваць каля будынкаў”.

У адрозненне ад праваслаўных, у католікаў Еўропы, 2 лютага—ачышчэнне. У Італіі, як і ў многіх народаў Еўропы, 2 лютага лічыцца канцом зімы – дзень Кандэлоры (Candelora, у правасл. – Стрэчанне). Там гавораць:

-- Per la Candelora dall'inverno siamo fora.

-- На Кандэлору мы ўжо за межамі зімы (КЗ, 1977. С. 13). Даследчыкі (с. 14) каляндарных звычаяў Італіі лічаць, што Кандэлора з'яўляецца добрым прыкладам таго, як “бацькі царквы” стваралі новыя хрысціянскія святы з мэтай выкарыстання язычніцкіх. Так, згодна народных традыцыяў люты лічыўся месяцам ачышчэння і выкуплення грахоў (dies februatus – дзень ачышчэння). Такі ж характар насіла і свята пастухоў Луперкаліі, што адзначалася ў сярэдзіне месяца ў воўчай пячоры (lupercal). Выцясніць гэты даўні народны звычай царкве дапамагала замена прызначэння на 14 лютага свята ачышчэння Марыі. Пазней жа, калі для Раства была прызначана дата 25 снежня, гэтае свята было адпаведна перанесена на 2 лютага.

Прычым, як і ў нашай традыцыі, кульмінацыйным момантам Кандэлоры з'яўляецца благаслаўленне свечак (“festum candelarum” -- свята свечак), якое было ўведзена ў Рыме ў самым канцы V ст. папай Геласіем I, як і выказваюць меркаванні італьянскія вучоныя, каб канчаткова знішчыць Луперкаліі.

У французаў Шандэлёр адкрывае вясну (“На Шандалёр бярыся за плуг, аратай”). Прыкмячалі: калі у гэты дзень дрэннае надвор'е, то зіма пратрымаецца яшчэ сорак дзён і мядзведзь выйдзе з бярлогі толькі праз сорак дзён (с. 31). Румыны “Stretenie” называлі яшчэ Мядзвежым днём (Ziua ursului) і таксама лічылі, калі мядзведзь не выйдзе з бярлогі, то зіма пратрымаецца яшчэ шэсць тыдняў (с. 296). Венгерскі мядзведзь таксама выглядаў на свята Марыі (Maria unnep) з бярлогі і калі бачыў сваю цень, то яшчэ лажыўся спаць, бо зіма яшчэ доўга працягнецца (с. 191).

У многіх краінах Еўропы 2 лютага адзначаюць дзень Марыі з асвячэннем свечак і пачатак вясны. Сербы лічаць, што на “Сретенье” сустракаецца зіма з летам. На думку некаторых даследчыкаў (с. 139) звычай са свечкамі звязаны з

дахрысціянскім рымскім культам ачышчэння і пакаяння, а царква прысвяціла дзень (40-ы пасля Раства) памяці ачышчэння Марыі і прынясення Хрыста ў храм. Чэхі і палякі свята называюць Грамніцамі. У Польшчы гавораць: "Jak na Gromnice jasno, w stodolach ciasno" – Як на Грамніцы ясна, у стадолах будзе цесна (с. 207). Прысмальвалі валасы дзецям, каб не баяліся ваўкоў. У Чэхіі: "Na Gromnice musi skrivan vrznout, i kdyby mel zmrznout" -- На Грамніцы павінен жаваранак піскнуць, нават калі замерзне (с. 221).

Згадкі, звязаныя з громам (запальванне свечак ў час навальніцы і г.д.), маюцца ў многіх народаў Пірэнейскага паўвострава, Германіі, Аўстрыі, Польшчы і інш. Наглядаюцца таксама ў іх некаторыя падобныя звычаі, прымаўкі, што вядомы беларусам.

. У палякаў: "Gromnica – zimy polowica". "Gromnica – latay sobie rekawice". Англічане ведаюць, што да Стрэчання неабходна трымаць у запасе палову сена і саломы. У немцаў маецца подобная прымаўка на ўсходнеславянскую: калі на Стрэчанне мяцеліца дарогу перамяце, то і корм падмяце – "Wenn am Lichtmess Schneegestober die Wege zuweht, weht es Futter darunter" (Ярмолаў, 1901. С. 74-76). (Гл.: 15 лютага).

**Агата.** У гэты дзень свяцілі соль і хлеб. Паводле народных вераванняў, хлеб мог бараніць ад пажару, перуна і раптоўных хвароб, таму вядома: "Хлеб святой Агаты не пусціць бяды да хаты" (Беластоцкае ваяводства; Ніва, 1989), а таксама: "Соль святой Агаты бароніць ад агня хаты" (Паўлюкоўскі, 1934; Сахараў, 1937). Вельмі падобнае ў Польшчы: "Chleb i sol swietej Agaty broni od ognia chany" (КЗ, 1977. С. 207).        У краінах каталіцкай Еўропы святая Агата таксама асацыіруецца з прыроднымі стыхіямі і лічыцца абаронцай ад стыхійных бедстваў.Французкія рукадзельніцы прыбіралі свяцільнік, вакол якога працавалі. Лічылі, калі ў дзень Агаты шмат вады, то будзе столькі ж малака; навальнічныя хмары прадказваюць градабойнае лета і ўраджай кукурузы. У Швейцарыі імкнуцца мець да дня святой палову запасаў сена і саломы (Ярмолаў, 1901. С. 84).

6/24. Аксіння Паўзімніца (Ксеня, Аксені). Называлі Аксінняй Паўзімніцай, бо дзяліла зіму папалам. У Заходнім Палессі гавораць: "Еслі на Оксэні мэтэ, то весь корм падмэтэ -- зыма шчэ будэ" (Маларыцкі р.; Талстая, 1986). Па Аксінні вызначалі надвор'е на ўсю вясну (Анічэнка, 1992. С. 47). Дзень прысвечаны прападобнай Ксеніі (V ст.). Пазней ў царкоўны каляндар была ўключана і блажэнная Ксенія Пецярбургская.

Дарота. "Па Дароце высахнуць хусты на плоце" (БСК, 1937)

З падобнай рыфмай, але іншым зместам маецца прымаўка ў палякаў. "Okolo swietej Doroty naprawiaj szczerze ploty" – Каля св. Дароты чыніць пара плоты (Ярмолаў, 1911. С. 85).

Найбольш папулярнай Дарота стала ў Чэхіі, затым Славакіі, дзе было распаўсюджана народнае драматычнае прадстаўленне аб святой, якая адмовілася стаць жонкаю караля (КЗ, 1977. С. 221).

7/25. Лічылася, калі нечакана пасля Стрэчання, 7 лютага, загрыміць гром, дык прападуць пожні (Паўлюкоўскі, 1934)

9/27. Іван Залатавус. У народным календары гэты дзень замацаваны за Іванам Залатавусам, а не за Іаанам Златавустам, як ў царкоўным. Згодна легендзе,

Касьян падпаліў Івану Хрысціцелю вусы. Бог пакараў Касьяна тым, што яго прысвятак адзначылі толькі адзін дзень у чатыры гады -- 29 лютага па старым стылі. А Івану Бог падараваў залатыя вусы (Раманаў, 1891). Івана Залатавуса святкуюць і ў іншыя дні года. У гэты дзень хрысціянскай царквою адзначаецца Перанясенне мошчаў (438 г.) свяціцеля Іаана Златавуста, канстанцінопальскага епіскапа, цудоўнага прапаведніка. Толькі на рускую мову перакладзены яго творы ў 12 вялікіх тамах.

10/28. Яфрэм Сірын. На Смаленшчыне лічылі, што ў Яфрэмаў дзень хатнік сваволіць на дварах, таму яго частавалі, пакідаючы страву і гаварылі: "Гаспадар-бацюшка, беражы жывёлу", "Гаспадарушка, бацюшка, хлеб-соль прымі, жывёлу вадзі". Былі і прыкметы: калі на Яфрэма ў поўдзень сонечна ці сярод дня мяцеліца – будзе ранняя вясна, а калі вецер, то лета – сырое і дажджлівае (Анічэнка, 1992).

Акрамя прападобнага Яфрэма Сірына, які жыў у 300-ых гадах, царкоўны каляндар у гэты дзень адзначае яшчэ двух Яфрэмаў і Ісаака Сірына.

11/29. Ігнат. Праз некалькі дзён наступяць Грамніцы, а Ігнат іх сустракае, таму і кажуць у народзе: "Ігнат Грамніцам рад".

Назва ў народным календары паходзіць ад свяшчэнапакутніка Ігнацiя Баганосца, мошчы якога ў гэты дзень праносіліся ў 107 г. Епіскап, пакутнік за веру Хрыста быў асуджаны пад час царавання Траяна на смерць цераз разарванне дзікімі звярамі на народным відовішчы. Царкоўны каляндар таксама адзначае памяць свяціцеля Лаўрэнція Тураўскага, затворніка Пячэрскага, епіскапа Тураўскага (памёр у 1194 г.) і іншых.

12/30. Тры Свяціцелі. У народзе яшчэ называюць Васілля ды Рыгора. У царкоўным праваслаўным календары - дзень Трох святых: Васілля Вялікага, Рыгора Багаслова, Іаана Залатавуста. У гэты прысвятак не пралі (Дамбавецкі, 1882) і не “жлукцілі” (Косіч, 1901), г. зн. не мачылі бялізну для мыцця ў старадаўняй “пральнай машыне”.

13/31. У некаторых раёнах перад Грамніцамі адзначалі Стрэчаньскія Дзяды (Талстая, 1986).

14/1. Трыфан. Назіралі за прыродай, зоркамі. "На Трыфана зорна -- вясна позняя" (Паўлюкоўскі, 1934). Гэты ж дзень - і Грамнічны бацька, бо заўтра ўжо Грамніцы. Да іх рабілі свечкі з асенняга воску. У Віцебскім і Полацкім паветах у апошнюю суботу перад Грамніцамі, рыхтавалі "ахвярныя" грамнічныя свечкі са свайго воску (Нікіфароўскі, 1897) Святы пакутнік Трыфан нарадзіўся ў Малой Азіі, а ў 250 г. яму адсеклі галаву падчас жорсткіх ганенняў хрысціян. Добра шануецца Рускай праваслаўнай царквою. Частка мошчаў святога знаходзяцца ў Маскве, у храме, што носіць яго імя.

У Балгарыі (Трифун, Зарезан, Трифоновден, св. Трифон, Трифун, Зарезой, Трифон Пияница, Трифон Чипият-курносы) лічыцца днём садаводаў і карчмароў з добра развітымі традыцыямі; у Румыніі (не разумны Трыфан – Sfintul Trifon) апекуном ваўкоў. Валянцін. Амаль для ўсяго свету дзень святога Валянціна -- свята закаханых. Згодна адной з легендаў яно ўсталявалася ў гонар пакаранага смерцю ў гэты дзень (III стагоддзе) рымскага святара і лекара Валянціна, які насуперак указу жорсткага імператара Клаўдзія II тайна вянчаў закаханых, якім прадстаяла служба ў войску. Існуюць і іншыя версіі ўзнікнення свята, а таксама

шмат традыцый яго адзначэння: англійская, аўстрыйская, амерыканская, шведская, іспанская, італьянская, французская, германская, японская ды інш. Расія ды Польшча да еўрапейскай традыцыі святкавання прыйшлі нядаўна. Развіваецця гэты вясёлы маладзёжны звычай і ў Беларусі. Раней ў беларусаў-католікаў Валянцін быў звычайным прысвяткам земляробчага календара. Вось што, напрыклад, зафіксаваў польскі этнограф і фальклярыст З.Глогер: "Каб збожжа ў полі не елі ад самага пачатку вераб'і, трэба сеяць у такі дзень тыдня, на які выпадае свята св.Валянціна" (1876 г.).

У Польшчы абсявалі попелам поле, каб святы Валент адганяў вараб'ёў (КЗ, 1997. С. 207). У іншых народаў Еўропы з Валянцінам звязана нямала бытавых прыкмет.

15/2. Грамніцы (Грамнічнік, Стрэчанне, Устрэчанне) -- дзень першай сустрэчы зімы з летам, свята свечкі і "жывога агню", што паводле язычніцкіх вераванняў, абараняе чалавека ад злых духаў. У хрысціянскі перыяд васковыя свечкі пачалі асвячацца ў царкве. Гэты звычай вядомы ў многіх краінах Еўропы. Яны захоўваліся ўвесь год. На Грамніцы беларусы выпальвалі "крыжы" (дзве палачкі, пакладзеныя адна на адну, пры дапамозе якіх раней здабывалі "жывы агонь") на будынках, каб зберагчы жытло ад нябесных стыхій (дажджу, маланкі); крыжападобна засмальвалі валасы на галовах дзяцей і на жывёле, каб адагнаць злых чарадзееў, ведзьмакоў. Для гэтых мэт грамнічныя свечкі пакідалі ў хлявах. Іх запальвалі пры грымотах, калі выганялі кароў вясною, на засеўках, сустракаючы нованароджанага, у вясельных абрадах; клалі ў рукі нябожчыку (Крачкоўскі, 1874; Шэйн, 1887).

Вось як распавядаецца ў Астравецкім раёне: “Льюць яе з добрага воску. Калі будзе моцны гром, вялікі дождж ды пярун з маланкаю, выносяць свечку на дождж, каб ён хоць трохі яе замачыў. Тады кажуць: Пярун-бацька, Зямля-матка, прыміце нашу ахвяру. Хай будуць усе здаровыя. Хай згіне нячыстая сіла. Хай расце добрае жыта. Ну і далей, што каму баліць. Тады ставяць свечку пад іконамі і моляцца. Добра, каб гэта было на Грамніцы. Трэба ж яшчэ і ў царкве асвяціць, у бутэльку паставіць галінку вярбы, зрэзаную ў Вербную нядзелю”. Паказала майстрыха і ручнік з сімвалам грамнічнай свечкі. Ніякага рэалізму: квадрат да якога прымыкаюць 8 квадратаў, ромбікаў, авальных фігур.” (Кацар, 1996).

Па стану надвор'я ў той дзень вызначалі будучае. Казалі: калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы; як на стрэчанне рана ўзыходзіць сонца, то будзе ранні лён; калі снег перамятае цераз дарогу, то чакаецца позняя вясна (Дабравольскі, 1914); у якую пару дня на Грамніцы пакажацца з-за хмар сонца, пасеяны ў такую пару вясны лён дасць найбольш надзейны ўраджай; пахмурныя Грамніцы варожаць на поўны неўраджай ільну (Федароўскі, 1897). У народных песнях гаворыцца:

Святыя Грамніцы свечкі сукаюць,
Свечкі сукаюць, на прыстаў стаўляюць.

У гэты дзень спявалі першую вяснянку:

Зіма з летам сустракалася,

Пра здароўейка пыталася. (Гомельскі раён)

А ў нас сення Стрэчанне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася,
І ножачку звіхнула, звіхнула.
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы. (Талачынскі раён)

Са Стрэчання падумваюць ужо пра вясну. Кажуць: "Да Грамніцы не скідай з рук рукавіц, а як прайшлі Грамніцы, то не патрэбны рукавіцы". Іншы раз, праўда, даводзілася пераконвацца ў справядлівасці і такой прымаўкі: "Грамніцы - зімы палавіцы". Ва ўсякім выпадку ў некаторых мясцінах усе, хто хадзіў на заробкі, да Стрэчання спяшаліся вярнуцца назад, і гаспадары пачыналі рабіць, аглядаць , рамантаваць прылады, патрэбныя для вясновых заняткаў (Ашмянскі павет; Крачкоўскі, 1874).

Назва народнага календара "Стрэчанне" мае гукавое падабенства з царкоўнай - Срэценне (Сустрэча) Госпада нашага Ісуса Хрыста. Згодна Біблії, лёсвызначальная сустрэча адбылася ў старца Сімеона з Іерусаліма, які чакаў Месію: яму было падказана Духам Святым, што ён не памрэ, не ўбачыўшы Выратавальніка. Старац прыйшоў у храм якраз тады, калі Марыя і Іосіф прынеслі Дзіця на саракавы дзень ад нараджэння дзеля царкоўнага абраду.

Рускі народны каляндар называе гэты дзень “Сустретьев” або “Сретенье” (бліжэй да царкоўнага наймення), у некаторых раёнах – яшчэ і “Грамніцы”. А вось БНК даволі ўдала тлумачыць, што Грамніцы звязаны з культам Перуна (Грамаўніка). Яшчэ Е. Раманаў (1917) заўважыў, што назва Грамніцы ўзята ад католікаў, ці, што найбольш верагодна, ад уніятаў. Другі збіральнік і даследчык фальклору М. Нікіфароўскі (1897) тлумачыў: “Грамніцы атрымалі назву ад таго, што ў гэты дзень св. Юрый выпрабоўвае на чарцях сваю стрэльбу...”; А. Сержпутоўскі (1930) – “Старыя кажуць, што яны памятаюць такі год, што на Рамніцы былі грымоты, так смаліў Пярун, што рэдка бывае й па лету. Можа, затым гэта свята называецца Грамніцамі, што з яго пачынаюцца грымоты да што яно імі камандуе”; М. Улашчык (1989) – “на Грамніцы рабілі захады супраць перуна...” Акрамя гэтага дня, украінцы Грамніцамі называюць яшчэ першыя аўторак і сераду пасля велікоднага тыдня, а таксама панядзелак і аўторак – трэцяга (Талстая, 1984).

Нават з гэтай невялікай падборкі складаецца ўражанне аб прысутнасці слядоў Перуна на Грамніцах. Гэта не выклікае сумнення і ў сучасных даследчыкаў, якія знаходзяць ўсё новыя пацвярджэнні дадзенай гіпотэзе. Выключэннем з' яўляецца, на наш погляд, не зусім падмацаваная думка І. Крука (1998. С. 174-175). У складзенай ім “сістэме” не ўкладваюцца гэтыя, як і некаторыя іншыя, бясспрэчныя факты. Думаю: недастаткова сумненняў фалькларыста, што Перуна адзначалі 2 жніўня, каб не ганараваць ці ўспамінаць яго і ў іншыя дні календара. Далей аўтар спрачаецца не так з калегамі, як з народам: “Незразумела: калі на Стрэчанне гэта сустрэча ўсё ж адбылася, то навошта тады праз паўтара-два месяцы яе гукаць, спраўляючы абрад “гукання вясны”. Справа ў тым, што ва ўяўленні язычніка, гэта была часовая сустрэча (тут

не адкідаецца магчымасць замежнага ўплыву, як паказваюць факты прыведзеныя раней), пасля якой у іншыя дні перамагала, то зіма, то вясна, што сімвалізавалася "капяжамі", якую зноў прыйдзецца гукаць і якая пазней ўяўлялася больш у выглядзе птушкі.

Грамніцы адлюстроўваюць матывы міфа паядынка грамаўніка са злою сілаю. А дачыненне Грамніц да грамавержца магло прыйсці праз яго праціўніка Вялеса, "скотьего бога", прысутнасць якога ў гэты перыяд не выклікае сумнення. Дарэчы, каляндарныя дні, якія маюць адносіны да навальніцы, маюцца нават па некалькі ў кожным месяцы, як даказвае У.Уласаў (1993. С. 122-123). Ён жа прыходзіць да вываду, што каляндарнае развіццё свят, прысвечаных грамавержцу і яго праціўніку, выглядае наступным чынам: палеаліт – 25-26 сакавіка – дзень асноўнага міфалагічнага "паядынку", культ татэмічнага продка, 23 красавіка – адраджэнне татэма; мезаліт – 8-10 мая, 29-30 чэрвеня, 20 ліпеня (галоўнае свята); неаліт – дні грамавержца ўсталёўваліся ў адпаведнасці з мясцовымі ўмовамі, асноўныя дні Вялеса – 11 лютага, 23 красавіка, 9 мая, 16 верасня (с. 125).

18/5. Агата. Прысвятак прысвечаны каровам, у Расіі называецца Агаф'я Кароўніца. Асвячалі хлеб з соллю, які затым натыкалі жывёле на рогі, каб не баялася ўрокаў. Хлеб той нібы дапамагаў таксама адводзіць пажар (Берман, 1874). Названы ў гонар святой пакутніцы Агаф'і ( 251 г.) з Сіцыліі. На допыце верную хрысціянку мучылі: раздзіралі кіпцюрамі грудзі, затым адрэзалі саскі. Але здарыўся цуд: яны зноў з'явіліся, бо ў цямніцу да яе з'явіўся святы Пятро і праз некаторы час у горадзе пачаўся землятрус. Вельмі падобны звычай 5 і 18 лютага ў Швейцарыі, дзе таксама асвячалі муку, хлеб і соль. Хлебу Агаты прыпісвалі цудатворную сілу, у час пажару, напрыклад, кідалі кавалкі яго ў агонь (КЗ, 1977. С. 176) ( гл. таксама 5 лютага).

19/6. Вакулы. На Палессі лічылася, што Вакула ахоўваў ад ператварэння ў ваўкалакаў (Зяленін, 1915). Аб існаванні легенд аб гэтых пярэваратнях яшчэ пісаў старажытнагрэчаскі гісторык Герадот. У Беларусі іх існуе нямала. У рускіх вядома як прысвятак Вуколы Цялятнік, з якога пачынаецца вясенні ацёл кароў.

У царкоўным календары -- прападобны Вукола, епіскап Смірнскі (каля 100 г.).

22/9. Пятро. З прысвяткам звязана прыкмета: калі на Пятра цёпла -- зіма працягнецца да Вялікадня (БСК, 1937). Таксама нямала прыкмет аб надвор'і маецца і ў іншых народаў. У скандынаваў і фінскіх лапароў ёсць павер'е, згодна якога святы Пятро кідае ў гэты дзень у ваду гарачы камень, таму рэкі, азёры і моры становяцца цёплымі (КЗ, 1977. С. 135). У немцаў Вестфаліі лічыцца пачаткам вясны. З песень сведчыць, штоSt. Petri Stuhl den Fruhlind winkt St. Peter stosst den Brand in die Erde. Прастол св. Пятра падае знак вясне, Св. Пятро гоніць цяпло ў зямлю (С. 140). Дзеці ў гэты дзень у кожным доме стуканнем драўляных малаткоў "выганялі" розных драконаў і змеяў. Аўстрыйцы гавораць: "St. Petristuhl dem Fruhling winkt. Дзень святога Пятраківае вясне" (С. 163).

23/10. Прохар. Заўважалі, што ў гэты дзень ласі скідаюць рогі, бліжэй становіцца да вясны. "Прыйшоў Прохар да Улас -- скора вясна ў нас." (Васілевіч, 1992). Сярод шэрагу імён, якімі пазначаны гэты дзень у царкоўным календары, маецца прападобны Прохар Пячэрскі (пам. у 1107 г.), родам са Смаленска.

24/11. Аўлас (Уласce, Уласце, Улас). Лічыўся святам жывёлы ("каровіным і конскім"). У адрозненне ад Валосага, Крывога чацвярга, які бывае на Масленічным тыдні, Аўлас мае сталае месца ў календары. Магчыма, царкоўнікі, каб адцягнуць увагу ад язычніцкага культу Воласа-Вялеса, увялі па сугуччы на гэты дзень адзначэнне свяшчэнапакутніка Уласія Севасційскага ( каля 316 г.) Епіскап Уласій быў абаронцам дзікіх звяроў, іх лекарам. У многіх рускіх губернях на Уласьеў дзень прыносілі ў царкву свежае каровіна масла і лажылі пад абраз Уласія. Гэтая ахвяра называлася "валожнай" або "валоснай" (Някрылава, 1996). Наогул даследчыкі мінулага і сучаснага адзінадушны ў думцы аб замене язычніцкага культу Воласа-Велеса на імя свяшчэннапакутніка. (Гл.: Рыбакоў, 1988. С. 419-421). На Аўласа таксама наглядалі за надвор'ем. Верылі, што каля свята сем маразоў: тры напярэдадні, адзін на Уласа і тры пасля яго (Паўлюкоўскі, 1934). Каб адпусціць ласку, якая псавала жывёлу ў адрыне, сяляне вешалі пад столлю забітую варону. На Смаленшчыне спявалі:

Ты, Улас, Улас,
Каля рэчкі,
Ты найміся ў нас
Нашы свіначкі
Скату пасцівіць!
Каля асіначкі,
Нашы каровачкі
Нашы козачкі
Каля дубровачкі,
Каля лозачкі
Нашы авечкі (Смаленшчына; Дабравольскі, 1903)

У каталіцкіх раёнах Беларусі на гэты дзень прыходзіцца Мацей. Прыказкі гавораць: "На Мацея дарога пацее" (Берман, 1873; Паўлюкоўскі, 1934), "Калі на Мацея длонь спацее, то прадбачыцца добры год" (Свіслацкі р.); “На Мацея адліга –хутка будзе мароз” (БСК, 1939). Нездарма яго яшчэ называлі Сухім днём. У Аўстрыі гавораць: “Святы Мацíас ламае лёд, калі не знойдзе, то зробіць яго зноў” (КЗ, 1977. С. 163), у Чэхіі – “Svaty Matej hazi pluhy z punebi”--Св. Мацей кідае плугі з паднябесся, у Славакіі – “Matej l’ady lame”. Мацей ламае лёд(с. 222). У фінаў хрысціянскі Мацвей -- гэта дзень Зімовага або Цялячага Мацці (с. 123), у венграў – “ледакольны Маціаш” (с. 190). Дзень Аўласа (11 лютага) у Балгарыі прысвячаюць валам (Власов ден, Свети Влас, Власин ден). Народная этымалогія звязвае з хваробай валасоў (влас). Разглядаючы нацыянальныя традыцыі, балгарскія даследчыкі маюць меркаванне, што хрысціянскі Улас пераняў функцыі старaславянскага боства Воласа, апекуна свойскай жывёлы (КЗ, 1977. С. 276). Пераконваюць у гэтым звычаі і абрады сербаў, у якіх праяўляецца клопат аб жывёле, напрыклад, абрад «воловска богомола»; а таксама югаслаўскія тапонімы: Велес (Заходняя Сербія), Велесница (на Дунаі), Велестово (Чарнагорыя) (Іваноў, Тапароў, 1974. С.46).

26/13. Фаціння. Лічылася заступніцай ад ліхаманак, трасцы (Раманаў, 1912; Паўлюкоўскі, 1934). У царкоўным календары адзначаюцца прападобныя Зоя і

Фаціння (Святлана)  -- V стагоддзе, а таксама Марцініян, Яўлогі, Стэфан і свяціцель Георг Магілёўскі). *Дзедаў (Памінальны, Усёядны, Усерадны, Сплашны) тыдзень (Памінальніца) -- передапошні тыдзень мясаеда (трэці ад канца) перад Вялікім постам, прысвечаны памяці памёршых продкаў, "дзядоў". Асабліва ўрачыста адзначалі ў пятніцу і суботу. Не працавалі, каб не шкодзіць "мёртвым душам". У царкоўнікаў гэта быў тыдзень Мытара і Фарысея (за 10 тыдняў перад Вялікаднем). Прытча пра іх заканчваецца вядомымі словамі: кожны, хто ўхваляе сябе, супакоіцца, а супакоены сабою, узнясецца. Фарысей жыў справядліва, але грашыў гардыняю, а збіральнік падаткаў, што, несумненна, грашыў на працы, быў апраўданы Богам, бо прасіў пакаяння (Евангелле ад Лукі. 18, 9).

Пра снежныя завеі ў пачатку тыдня на Гомельшчыне гаварылі: "Ета Усеядная ў госці едзя!", а ў канцы тыдня: "Ета із гасцей Усеядная едзя!". (Раманаў, 1912).

Вельмі шмат прыкмет і прымеркаванняў звязвалі з Усеядным тыднем смаленскія беларусы. Лічылася, калі "вея" (мяцеліца) была ў нядзелю, то авёс неабходна сеяць на дзевятым тыдні; калі ж у панядзелак, то -- на восьмым; калі ў сераду ці чацвер, то пакідалі "дзесяцінкі дзве". І наогул, калі надарылася вялікая мяцеліца на тыдні, то авёс трэба сеяць раней (Дабравольскі, 1894).

*Рабы тыдзень (Вясельніца, Масляныя Загвяны) – апошні тыдзень перад Масленкай, дзевяты перад Вялікаднем. Яшчэ дазваляецца есці малако і мяса (і як мага болей, як лічылі ў Суражскім павеце), нават у сераду і пятніцу (Шлюбскі, 1927).

*Лысая серада. Серада перад Масленіцаю. На Смаленшчыне прыгаворвалі: "Лыса, лыса серада, блакітны чацвер" (Дабравольскі, 1914). Перадвясенні дзень атрымаў назву з-за праталін-"залысін", што з'яўляліся на прагрэтай зямлі.

*Блакітны чацвер... Туманны дзень перад Масленіцаю на Смаленшчыне (Дабравольскі, 1914).

*Масляныя Дзяды (Мясаедныя, Паставыя, Зімовыя, Стрэчаньскія) -- пятніца і субота, а ў некаторых раёнах Беларусі яшчэ і чацвер, перад Масленіцай; называлі таксама Дзедавай пятніцай. Раніцай палілі печку, бялілі ў хаце, засцілалі стол чыстым абрусам, вешалі новы ручнік -- чакалі гасцей, "дзядоў". Пасля рытуальнага абеду пакідалі на стале "дзядам", у сувязі з чым гаварылі: "Дзяды не знали бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі" (Свіслацкі раён).

*Дзедавая субота (Бабы). Праваслаўная царква ў перадвялікадным тыдні ў суботу адзначала Усяленскую бацькоўскую (мясапустную) суботу як дзень памяці аб Страшным судзе, аб памёршых. У "Настольнай кнізе свяшчэннаслужыцеля" запісана: "У суботу ж, а не ў іншы дзень, перад мясапуснай Нядзелей патрабуецца маленне аб супакаенні душ таму, што дзень суботы, як дзень супакою, па свайму значэнню, ёсць найзручнейшы для малення -- супакоіць памёршых са святымі. Акрамя таго, гэтае маленне аб супакаенні ўсопшых св.Царква напамінае нам пра непазбежную і для нас канчыну і будучым выпрабаванні аб непадкупнага Суддзі, каб, застрашыўшыся гэтым, зрабіць нас больш падрыхтаванымі да подзвігаў наступаючага ўратавальнага посту".

*Масленіца (Масленка, Масніца) - пачатак (з панядзелка) Масленага (Сырнага, Крывога, Пустога, Развітальнага) тыдня (восьмага перад Вялікаднем),

даўняга свята заканчэння зімы, таму і гаварылі: "Масленка зіму праводзіць, год -- сустракае". Прыстасавана царквою да апошняга тыдня перад постам. Мясное не елі, а толькі малочнае. Гаварылі, што Масленіца бывае "на маладзіку" ("рог месяца ўмачыў у масла"). Наладжвалі гульні. Ездзілі на конях, каталіся на санках. Дзяўчаты насілі хусткі з доўгімі махрамі, каб вырас доўгі лён. Дзеля гэтага неабходна і надалей праехаць з горкі (жанчынам на прасніцы), і найвышэй гушкацца на арэлях. На Смаленшчыне прыкмячалі, які добры дзень на Масленым тыдні -- у той дзень ад Іллі некалі сеялі лён. Там жа гаварылі: "Масленіца ў вятху (пасля поўні. -- А.Л.), дзяржы пшаніцу ў мяху; сей пшаніцу ва ўсю руку, калі Масленіца ў маладзіку" (Дабравольскі, 1914; Нікіфароўскі, 1897).

Найбольшая колькасць вяселляў прыпадала на паслякалядны перыяд -- Малую вясельніцу, якая заканчвалася першым днём Вялікага посту. Дзяўчаты хлопцам вешалі калодкі за тое, што яны не паспелі да Масленіцы ажаніцца, і тыя адкупляліся гарэлкаю, салодкім. Асабліва святкавалі ў апошнія дні, суботу і нядзелю. Каталіся на конях (у некаторых раёнах прадучы), упрыгожанымі рознакаляровымі стужкамі і званкамі, спявалі:

Мы думалі: Масьлінка сем нядзелік,
Ажна Масьлінкі сем дзянёцкыў!
Нас Масьлінка абманіла,
На сем нядзель пыста пысыдзіла,
На белую капусту,
На горкую рэдзьку. (Веліжскі павет; Раманаў, 1912).

Кожны дзень тыдня меў сваю назву, пачынаючыся ад панядзелка і заканчваючы нядзеляй: Сустрэча, Заляцанне, Ласуха (Пералом), Шырокі, Цешчыны вечары, Залвіцыны вячоркі, Развітальны (Дараваны) дзень. Моладзь выстройвалася і вадзіла па вёсцы "масленіцу", "каб лён добры вырас". У Сенненскім павеце на першы дзень свята жанчыны на санях "вазілі маладую", якая ў апошні Мясаед выйшла замуж. Спявалі ёй:

Маладая ты Марутка,
Выйдзі, выйдзі к нам на вулку!..
Вазьмі сыра -- родзіш сына,
Вазьмі мачку -- родзіш дачку,
Вынісь рэпку -- родзіш слепку...

Муж "маладой" частаваў усіх (Шэйн, 1887). Спявалі яшчэ і так:

У нас сягоння Масленіца!
Прыляцела к нам ластавіца,
Села на калу,
Скінула масла па каму...

У Развітальную і Даравальную нядзелю вечарам праводзілі абрады развітання з малаком і прашэння даравання ў старэйшых. Паходжанне назвы "Масленіца" даследчыкі звязваюць з парой, калі пачыналіся ацёлы і з'ўлялася

новае малако, а затым тварог і масла. На гэтай падставе ўзнікла традыцыя пакланенння язычніцкаму Воласу, што з'яўляўся апекуном жывёлы. Вобраз Масленіцы апяваецца беларускімі вышывальшчыцамі. Яе лёгка знайсці сярод іншых. “Стылізаваная жаночая фігура з узнятымі рукамі: у адной – сімвал сонца, у другой – масленічны блін”, “Ёсць і моцна стылізаваныя, умоўныя сімвалы геаметрычнага характару” (Кацар, 1986. С. 95). Большая традыцыя сьвяткавання Масленіцы наглядалася ў рускіх. А, наогул, яна шырока вядома ад Заходняй Еўропы да Сібіры. У многіх народаў – гэта нацыянальныя святы з вялікімі карнаваламі. Галандцы і фламандцы Нідэрландаў і Бельгіі называюць “канунамі посту” Вастэнавонд (ад галанскага дзеяслова vasten – пасціцца (КЗ, 1977. С. 71). Вядома, што Масленка мае дахрысціянскае паходжанне, што была прымеркавана да веснавога сонцастаяння. Акадэмік Б.Рыбакоў лічыць, што галоўнае сакавіцкае свята азначалася, верагодна, каля свята Благавешчання і “толькі хрысціянскі Вялікі пост, пачатак якога прыпадаў то на люты, то на сакавік, адсунуў язычніцкую Масленіцу за межы яе сапраўднага месца ў календары...” (1986. С. 667-668). На поўдні Беларусі Масленіца, як провады зімы, накладвалася на Гуканне вясны. Хрысціянская царква прымеркавала даўні народны звычай да свайго “рухомага” календара. Напярэдадні Вялікага посту не елі мяса і называюць апошнюю нядзелю “сурапустнай” або “прошчанай”. У царкве співаюць аб выгнанні Адама і Евы з раю і вернікі бачаць сябе ў свеце, у якім існуе грэх і смерць, і ўступаюць у новую фазу жыцця (пост), даруючы адзін аднаму грахі.

Даследчыкі (с. 221) знаходзяць у масленічных традыцыях народаў Еўропы напластаванні, што склаліся пад уплывам славянскага язычніцтва, культа Дыяніса і Бахуса, хрысціянскай рэлігіі.

*Крывы (Тлусты) чацвер -- чацвер на Масленым тыдні. У Драгічынскім і іншых раёнах -- Валосы (Валосся). Існавала шмат забарон. "На Валосого бліны пыклы ці оладкы, коб булы вылы гладкы" (Талстая, 1984), -- гавораць і цяпер на Заходнім Палессі, тое ж зафіксавана яшчэ і раней на ўсходзе Беларусі (у Магілёўскай губерні): “пякуць аладкі адпаведна колькасці кароў у гаспадарцы і кожнай даюць па аладцы, каб былі гладкія і тлустыя” (Забабоны, 1849). У Віцебскай і Магілёўскай губернях на Валосся добра даглядалі жывёлу, "піравалі", спявалі песні з прыпевам: "Ах ты, ладо, мае ладо!", "аб'язджалі маладога бычочка або жарэбчыка", які дасягнуў трохгадовага ўзросту (Шэйн, 1887; Раманаў, 1912). Нездарма, даследуючы старажытныя капішчы балтаў і славян, Б.Рыбакоў заўважае “адзінства шэрагу бостваў (Перуна, Лады, Велеса)” (1988. С. 161.) Раней ў гэты дзень у Гомельскім павеце нанімала "мір-грамада" сабе пастуха (Раманаў, 1912). У Гродзенскай губерні гатавалі мясную ежу. "Валачыліся" ўздоўж вёскі, каб урадзіўся доўгі валакністы лён і вадзілася жывёла (Раманаў, 1911; Федароўскі, 1897). Павер'і тыя ў Свіслацкім раёне памятаюць і сёння. Яшчэ сцвярджаюць: "На Валосся цягалі за валосся, але Валосся цяпер ужо звялося".

У некаторых мясцінах адзначаюць Улас, Аўлас. Гэта свята -- рэшткі культу Вялеса, язычніцкага бога жывёлы. У Кобрынскім павеце ўнукі вазілі на санях сваю бабу-павітуху. Частавалі яе "сялянкай" -- спецыяльнай рытуальнай стравай, зваранай са смятаны, масла і сухога сыру (Шэйн, 1902). Не Лепельшчыне і Ушаччыне гаварылі: "Аўлас на сыры лас" (Пшчолка, 1912). Гэтая акалічнасць таксама прымацоўвае дзень Аўласа (найперш, Вялеса) да Масленага тыдня.

Царкоўны каляндар не фіксуе асаблівага адзначэння чацвярга, які выглядае як язычніцкае святкаванне. Накладзенне і перапляценне хрысціянскага Аўласа з Валоссем выглядае даволі штучнай справай. *Попелец – серада сёмага тыдня перад Вялікаднем (46-ы дзень), пачатак Вялікага посту ў католікаў. Свенціцца попел вярбы, якая была пасвечана ў мінулым годзе на Вербнай нядзелі, і пасыпаецца на галаву ў знак божых пакут.

Асабліва аздначаліся папярэднія дні. Палякі гэты перыяд называюць Запустамі, Менсапустамі, Карнавалам, які цягнууся да Трох Каралёў (7 ст.) у адных раёнах, ці апошні тыдзень, што адпавядае ўсходнеславянскай Масленіцы. Звычаі і абрады адлюстроўваюць супрацьборства зімы і вясны, накіраваны на ўрадліваць і плоднасць, памінанне продкаў. Пашыраны карнавальныя пераапрананні, паўтарэнне каляднага ваджэння “туруня”, “казы”, “каня”, “бачана” (бусла), “мядзведзя” і іншыя традыцыйныя звычаі (КЗ, 1997. С. 202-207).